Установа адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Рэктар установы адукацыі
“Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”
_____________________ М.Р.Баразна
14.05.2019
Рэгістрацыйны № УД 3-19-3 / у.м.

**ПРАГРАМА**

ўступнага экзамену ў магістратуру
па спецыяльнасці
1-21 80 14 “Мастацтвазнаўства”

2019 г.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
А.С. Бохан, прарэктар па вучэбнай рабоце ўстановы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
Г.Г. Шымелевіч, дацэнт кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;
М.Л. Карпянкова, загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў” (пратакол ад 08.04.2019, № 4);

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў” (пратакол ад 14.05.2019, № 3).

Нармакантралёр, метадыст
вучэбна-метадычнага аддзела
Г.А. Апанайка
19.04.2019

Адказны за рэдакцыю
М.Л.Карпянкова

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Уступнае выпрабаванне ў магістратуру па спецыяльнасці 1-21 80 14 “Мастацтвазнаўства” праводзіцца з мэтай конкурснага адбору абітурыентаў магістратуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Выпрабаванне праводзіцца ў форме комплекснага міждысцыплінарнага экзамену па дысцыплінах “Гісторыя замежнага выяўленчага мастацтва” і “Гісторыя выяўленчага мастацтва Беларусі”. Падчас экзамену вызначаецца схільнасць абітурыентаў да навуковай дзейнасці, шырыня іх кругагляду і глыбіня ведаў у галіне гісторыі выяўленчага мастацтва. На экзамене таксама правяраюцца аналітычныя здольнасці абітурыентаў, арыгінальнасць мыслення, уменне лагічна выказваць думкі, індывідуальны мастацкі густ і іншыя якасці, неабходныя для даследчыка-мастацтвазнаўцы.

Праграма ўступнага экзамену складзена з улікам патрабаванняў дзяржаўных адукацыйных стандартаў па спецыяльнасцях, па якіх праводзіцца падрыхтоўка спецыялістаў у Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў на мастацкім факультэце, а таксама на факультэце дызайну і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Яна ахоплівае найважнейшыя пытанні гісторыі выяўленчага мастацтва (жывапісу, графікі, скульптуры), дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (мастацкай керамікі, шкла, мастацкага металу, тэкстылю, мэблевага мастацтва) і архітэктуры і складаецца з двух раздзелаў – “Гісторыя замежнага выяўленчага мастацтва” (складальнік Г. Г. Шымелевіч, М. Л. Карпянкова) і “Гісторыя выяўленчага мастацтва Беларусі” (складальнік А.С. Бохан).

Праграма можа быць выкарыстана абітурыентамі магістратуры установы адукацыі “Беларуская дзяржаўаня акадэмія матацтваў” для падрыхтоўкі да ўступнага экзамену і падчас яго правядзення.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## РАЗДЗЕЛ 1. ГІСТОРЫЯ ЗАМЕЖНАГА ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

### 1. Першабытнае мастацтва

Асноўныя тэорыі паходжання мастацтва. Працоўная тэорыя. Спасціжэнне прыроды чалавекам у працэсе працоўнай дзейнасці. Фарміраванне асноў эстэтычнага пачуцця чалавека. Старажытныя рэлігіі і іх роля ў фарміраванні мастацкай дзейнасці чалавека. Магія. Анімізм. Фетышызм. Татэмізм. Палеалітычныя роспісы ў пячорах Еўропы, Азіі, Афрыкі. Выявы людзей і жывёл. Новыя формы працы і вытворчыя адносіны ў эпоху мезаліта, неаліта, бронзы. Змены ў характары мастацтва. Развіццё керамікі, дробнай пластыкі, разьбы па дрэве і косці. Першыя архітэктурныя збудаванні.

### 2. Мастацтва Старажытнага Егіпта

Мастацтва Старажытнага Егіпта. Мастацтва “дадынастычнага” Егіпту і перыяду Ранняга царства. Асноўныя помнікі будаўніцтва. Кераміка. Роспіс. Характэрныя асаблівасці егіпецкага стылю ў выяве на плоскасці (роспіс, рэльеф). Мастацтва перыяду Старажытнага царства. Манументальныя архітэктурныя комплексы, звязаныя з культам фараона. Найбольш значныя класічныя помнікі старажытнаегіпецкага мастацтва. Сярэднее царства: архітэктура, скульптура, рэльефы, роспісы. Новае царства: грандыёзнае храмавае будаўніцтва, новая роля манументальнай скульптуры, далейшае развіццё скульптурнага партрэта. Амарнскі перыяд у мастацтве Егіпта. Эклектызм у егіпецкім мастацтве падчас позняга перыяду.

### 3. Мастацтва антычнай Грэцыі.

Гісторыя і значэнне вывучэння антычнага мастацтва. Перыядызацыя мастацтва антычнасці. Грэцыя ў гамераўскую эпоху – фарміраванне асноў міфалагічнай свядомасці старажытных грэкаў. Эпоха архаікі. Узнікненне і развіццё ордэрнай сістэмы ў архітэктуры. Фарміраванне прынцыпаў старажытнагрэчаскай скульптуры. Класічная эпоха: асноўныя асаблівасці развіцця скульптуры і архітэктуры. Творчасць Мірана, Фідыя, Паліклета, Праксіцеля. Элінізм – распаўсюджанне ідэй і прынцыпаў грэчаскай культуры. Характэрныя асаблівасці мастацтва элінізму.

### 4. Мастацтва Старажытнага Рыма.

Мастацтва старажытнай Этрурыі. Асаблівасці мастацтва Рыма эпохі Рэспублікі і эпохі Імперыі. Рымскі партрэт – асаблівасці характарыстыкі вобразаў. Рымская будаўнічая тэхніка. Асаблівасці архітэктуры і горадабудаўніцтва. Форумы, аркі, віядукі, ратонды. Пантэон. Калізей. Жывапіс старажытнага Рыма: пампеянскія фрэскі.

**5. Заходееўрапейскае мастацтва эпохі Сярэдневечча**

Мастацтва Еўропы эпохі варварскіх каралеўстваў. Роля і значэнне арнаменту ў дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Раннехрысціянскае мастацтва. Тыпы хрысціянскага храма. Манументальны жывапіс, скульптура, мініяцюра. Раманскае мастацтва. Сэнс тэрміну “раманскае”. Хрысціянская базіліка як тып архітэктурнага збудавання. Манументальны жывапіс раманскай эпохі. Мастацтва кніжнай мініяцюры. Гатычнае мастацтва. Сэнс тэрміну “готыка”. Асноўныя асаблівасці гарадскога сабору гатычнага часу. Сацыяльныя і эстэтычныя прадпасылкі фарміравання гатычнага стылю. Прыкладное мастацтва ў Сярэдневяковай Еўропе. Цэхавая арганізацыя мастакоў і рамеснікаў. Раманскі і гатычны стылі ў прыкладным мастацтве.

**6. Мастацтва Візантыі.**

Роля і значэнне візантыйскага мастацтва ў культуры Сярэдневечнай Еўропы. Перыядызацыя візантыйскага мастацтва. Першы перыяд росквіту візантыйскага мастацтва. Сафійскі сабор у Канстантынопалі. Архітэктурны тып крыжова-купальнага храма. Візантыйскае мастацтва часоў іканаборства. Росквіт феадалізму ў Візантыі: архітэктурныя помнікі, школы жывапісу, мазаіка. Іканапіс: паняцце аб зваротнай жывапіснай перспектыве.

**7. Мастацтва італьянскага Адраджэння**

Сацыяльныя перадумовы ўзнікнення рэнесансных тэндэнцый у мастацтве. Адлюстраванне ў мастацтве ідэй гуманізму. Протарэнесанс. Творчасць Джота і С. Марціні. Мастацтва кватрачэнта. Творчасць Брунелескі, Данатэла, Мазача. Прынцыпы рэнесанснага мастацтва ў творчасці Учэла, фра Беата Анжэліка, Філіпа Ліпі і інш. Ідэі Саванаролы і іх уплыў на творчасць С. Бацічэлі. Ранняе Адраджэнне за межамі Фларэнцыі. Высокае Адраджэнне ў Італіі. Асноўныя асаблівасці Высокага Адраджэння. Развіццё архітэктуры. Творчасць Д. Брамантэ. Леанарда да Вінчы: асаблівасці таленту. Мэты і асаблівасці мастацкай творчасці Леанарда ў скульптуры, манументальным і станковым жывапісе. Р. Санці: творчы шлях. Творы Рафаэля ў Ватыкане (манументальны жывапіс, архітэктура). Вобраз Мадоны ў творчасці Рафаэля. Мікеланджэла Буанароці. Творчыя пошукі Мікеланджэла ў скульптуры і манументальным жывапісе. Асаблівае гучанне вобразаў Мікеланджэла. Венецыянскае мастацтва VI ст. Творчасць Джарджоне, Тыцыяна, Цінтарэта, Веранэзе.

**8. Мастацтва Паўночнага Адраджэння**

Ідэйныя і мастацкія асаблівасці паўночнаеўрапейскага адраджэння. Творчасць Губерта і Яна ван Эйкаў. Увага да рысаў чалавечага характару. Дакладнасць у дэтальным паказе прадметаў акаляючага свету. Асаблівасці светаўспрыняцця І. Босха і П. Брэйгеля Старэйшага. Развіццё пейзажнага і партрэтнага жанраў у нідэрландскім мастацтве. Узнікненне жанру групавога партрэта.

Адраджэнне ў Германіі. А. Дзюрэр – найбуйнейшы прадстаўнік нямецкага Адраджэння. Л. Кранах як партрэцiст і заснавальнік нямецкага пейзажнага жывапісу. Г. Гальбейн малодшы – прадстаўнік малодшага пакалення майстроў нямецкага Адраджэння. Мастацтва гравюры. Тэхналагічныя, сацыяльныя і эстэтычныя прычыны развіцця гравюры. Тэхнікі гравюры ў часы Адраджэння: разцовая, абразная, афорт. Творчасць Дзюрэра ў гравюры.

**9. Мастацтва Італіі XVI--XVIII стст.**

Два шляхі пераадолення крызісу ў італьянскім мастацтве на мяжы VI–VII стст. Акадэмізм Балонскай школы братоў Карачы. Рэалізм М. да Караваджо. Паняцце аб караваджызме. Мастацтва італьянскага барока. Творчасць Берніні ў архітэктуры, скульптуры, дэкаратыўным мастацтве. Асноўныя прыёмы жывапісу і архітэктуры ў стылі барока.

**10. Мастацтва Іспаніі і Фландрыі XVII ст.**

Культавае значэнне іспанскай скульптуры VII ст. Сістэма жанраў іспанскага жывапісу. Манументальная рэлігійная кампазіцыя. Творчасць Х. Рыберы і Ф. Сурбарана. Творчасць Д. Веласкеса. Развіццё жанраў партрэта і бытавой карціны. Распаўсюджанне стылю барока ў фламандскім мастацтве. П. П. Рубенс – найбуйнейшы майстар мастацтва Фландрыі. Сувязь творчасці Рубенса з італьянскім мастацтвам. Творчасць А. Ван Дэйка, Я. Іорданса, Ф. Снэйдэрса.

**11. Мастацтва Галандыі XVII ст.**

Залаты век галандскага жывапісу. Выключнае значэнне жывапісу ў жыцці галандскага грамадства VII ст. Сістэма жанраў у галандскім жывапісе. Перыяд станаўлення галандскага жывапісу: барацьба з маньерызмам і акадэмізмам. Караваджызм у галандскім мастацтве. Фарміраванне нацыянальнага напрамку ў жывапісе. Творчасць Ф. Хальса: наватарства ў партрэтным мастацтве. Эпоха росквіту галандскага жывапісу. Творчасць Рэмбрандта. Адметныя рысы мастацтва Рэмбрандта, своеасаблівасць творчай манеры і эвалюцыі творчасці мастака. Жанравы жывапіс Галандыі: асноўныя жывапісныя школы.

**12. Мастацтва Францыі XVII--XVIII стст.**

Фарміраванне новага стылю ў творах архітэктараў Ж. Лемерсье, Ф. Мансара, Ж. Ардуэн-Мансара. Светапогляд Ж. Кало ў яго гравюрах. Стыль барока ў французскім жывапісе. Творчасць Н. Пусэна – нараджэнне класіцыстычнага пейзажу. Адметныя рысы французскага мастацтва XVIII ст. – спалучэнне інтымнай лірычнасці з аналітычнай дасціпнасцю. Творчасць А. Вато і Ж.-О. Фраганара. Паняцце аб стылі ракако. Развіццё бытавой жанравай карціны. Творчасць Ж.-Б. Шардэна. Скульптура Францыі XVIII ст.: творчасць Э. Фальканэ.

**13. Мастацтва Расіі XVIII ст.**

Мастацтва “пятроўскай эпохі” (I чв. XVIII ст.). Станаўленне прынцыпаў заходнееўрапейскага мастацтва ў архітэктуры і выяўленчым мастацтве Расіі. Творчасць В. В. Растрэллі і паняцце аб “растрэлліеўскім” стылі ў архітэктуры. Архітэктура 1760–1790-х гг.: творчасць Ч. Камерона, В. Бажэнава, М. Казакова. Скульптура і жывапіс другой паловы XVIII ст. Развіццё стылістыкі рускага класіцызма.

**14. Класіцызм у архітэктуры і мастацтве**

Узнікненне стылю класіцызма як вынік пераадолення традыцый ракако і позняга барока. Зварот да антычнасці як нормы і мастацкага ўзору, сцвярджэнне перавагі абавязку над пачуццём, пафас розуму ў класіцыстычным мастацтве. Найбольш характэрныя прадстаўнікі класіцызму ў архітэктуры і мастацтве Заходняй Еўропы і Расіі.

**15. Рамантызм у мастацтве**

Непасрэдная эмацыянальнасць мастацтва рамантызму. Адлюстраванне стыхіі чалавечых пачуццяў. Сцвярджэнне ў творчасці рамантыкаў ідэй народнасці, вартасці нацыянальнай гісторыі. Т. Жэрыко – пачынальнік рамантычнага напрамку ў мастацтве. Э. Дэлакруа – найбуйнейшы прадстаўнік рамантызму ў мастацтве. Нямецкі рамантызм. Ф. О. Рунге, К. Д. Фрыдрых і інш.

**16. Рэалізм у мастацтве**

Мэты рэалізму ў мастацтве: непасрэднае адлюстраванне рэчаіснасці, гістарызм, пераадоленне састарэлага ўспрыняцця жыцця. Развіццё рэалістычнага пейзажу. Барбізонская школа жывапісу. Рысы крытычнага рэалізму – канкрэтны аналіз і крытыка сацыяльных умоў жыцця.Вызваленне гістарычнага жанру ад яго міфалагічнай і алегарычнай абалонкі. Далейшае развіццё жанравага жывапісу. Творчасць А. Дам'е. Г. Курбэ – найбуйнейшы рэаліст сярэдзіны XIX ст. Рэалізм у жывапісе Расіі: мастакі - “*передвижники*”.

**17. Імпрэсіянізм і постімпрэсіянізм**

Наватарскія пошукі ў еўрапейскім мастацтве 2-й паловы XIX ст. Значэнне творчасці Эдуарда Манэ і “баціньольскай школы” для развіцця імпрэсіянізма. Творчасць К. Манэ, А. Рэнуара, К. Пісаро, Э. Дэга. Сутнасць адкрыццяў імпрэсіяністаў. Асаблівасці жанравай сістэмы жывапісу імпрэсіяністаў. Значэнне творчасці Радэна для развіцця скульптуры. Нэаімпрэсіянізм. Пуанцілізм. Творчасць Ж. Сёра і П. Сіньяка. Значэнне адкрыццяў П. езана для развіцця жывапісу. Паняцце аб сезанізме. Творчасць Ван Гога і П. Гагена.

**18. Мастацтва Расіі XX ст.**

“Рускі авангард” 1900–1910-х гг. Мастацкія аб’яднанні 1910-х гг.: Саюз рускіх мастакоў, “Мир искусства”, “Бубновый валет”, “Голубая роза”, “Ослиный хвост” і інш. Сувязь рускага авангарднага мастацтва з еўрапейскім мадэрнізмам. Мастацтва Савецкай Расіі 1920-х гг. Ідэі УНОВИС, АСНОВА, ОСТ і іншых творчых суполак. Архітэктура савецкага канструктывізму.

Мастацтва Савецкай Расіі 1930–1950-х гг. Ідэйна-палітычная аснова змен у савецкім мастацтве. Асаблівасці формы і зместу мастацтва сацыялістычнага рэалізму. Змены ў стылістычнай праграме савецай архітэктуры 1930-х гг. Буйнамаштабныя праекты ў савецкай архітэктуры: рэканструкцыя Масквы, праект Палаца Саветаў. Мастацтва часоў Вялікай Айчыннай вайны. Агітацыйна-прапагандысцкая накіраванасць жывапісу, графікі, скульптуры. Манументальнае адлюстраванне народнага подзвігу ў вобразах мемарыяльнай скульптуры. Пасляваеннае аднаўленне савецкіх гарадоў (Сталінград, Смаленск, Севастопаль і інш.).

Мастацтва Расіі 1960–1980-х гг.: “суровы стыль”, развіццё антаганістычных плыняў “афіцыёзнага” і “андэрграўнднага” мастацтва ў СССР. Перспектывы і праблемы развіцця рускага мастацтва ў канцы XX ст.

**19. Мадэрнізм у мастацтве Захаду XX ст.**

Асноўны змест творчых пошукаў мадэрністаў. Разнастайнасць напрамкаў мастацтва мадэрнізму. Кубізм: сувязь з фармалістычнымі пошукамі ранейшых часоў, аналітычнае ўспрыняцце свету ў творчасці кубістаў. Творчасць Ж. Брака і Ф. Лежэ. Логіка творчага шляху П. Пікасо. Асаблівасці кампазіцыйнага і каларыстычнага рашэння твораў А. Маціса. Фавізм як напрамак жывапісу. Экспрэсіянізм – увасабленне сацыяльна-мастацкіх асаблівасцяў грамадскага светапогляду мастакоў пасля першай сусветнай вайны. Творчасць О. Дыкса, Г. Гроса, К. Кольвіц. Экспрэсіянізм у скульптуры: Э. Барлах. Творчыя прынцыпы пачынальнікаў і прадстаўнікоў абстрактнага мастацтва. Сюррэалізм С. Далі.

**20. Мастацтва II паловы XX ст. і першай чвэрці XXI ст.**

Тэорыя і практыка абстрактнага мастацтва 1940-1950-х гг.: ташызм, “ар-інфармэль”, абстрактны экспрэсіянізм. Творчасць Б. Ньюмана, М. Роткі, Д. Полака. Оп-арт як напрамак абстракцыянізму. Кінетычнае мастацтва: прынцыпы стварэння і тыпы твораў. Поп-арт як адлюстраванне ў мастацтве рэалій і міфалогіі грамадства спажывання. Новыя тэхналогіі тыражавання мастацтва. Выкарыстанне магчымасцяў фатаграфіі і кіно. Выхад мастака ў прастору жыцця, стварэнне арт-аб'ектаў і прасторавых інсталяцый. Э. Уорхал: арт-праектаванне мастацтва і асобы.

Флюксус. Перформанс і хэпэнінг як мастацкія практыкі. Ідэі і ўплыў Дж. Кейджа. Мастацкія праекты і тэарэтычныя ўстаноўкі Й. Бойса.

Мінімалізм і канцэптуальнае мастацтва. Уплыў ідэй архітэктуры і дызайну на фарміраванне мінімалісцкага напрамку. У. дэ Марыя. Ідэі і творчасць Д. Джада, Д. Флавіна, С. Левіта. Канцэптуалізм як мастацкі

кірунак і постфіласофская дзейнасць, імкненне аб'яднаць навуку, філасофію і ўласна мастацтва ў яго новым разуменні, пераход ад канкрэтна-пачуццёвага ўспрымання да інтэлектуальнага асэнсавання канцэпта. Паняцці артэфакта і канцэпта. Творчасць Дж. Кошута. З’яўленне ў Італіі напрамку “Артэ повера”. Творчасць М. Мерца, М. Пісталета.

Постмадэрнізм ў архітэктуры і мастацтве. Гульнявы і іранічныя пачаткі. М. Паладзіна, В. Комар і А. Меламід, І. Кабакоў. Трансавангард і творчасць Э. Кукі, Ф. Клементэ.

Творчасць і выставачная дзейнасць Ай Вэйвэя. Творчасць і ўзаемадзеянне з гарадской прасторай Бэнксі. Трансфармацыя выставачнай дзейнасці ў сістэме сучаснага мастацтва. Гісторыя і рэпрэзентацыя сучаснага мастацтва на сусветных выставах і фестывалях: Венецыянаская біенале, выстава “documenta”, “Скульптурныя праекты Мюнстэра” і інш.

## РАЗДЗЕЛ 2. ГІСТОРЫЯ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА БЕЛАРУСІ

### 20. Дахрысціянскае мастацтва на тэрыторыі Беларусі.

Каменны век на тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці мастацкай творчасці палеаліта, мезаліта, неаліта. Вырабы з косці і дрэва. Сістэмы арнаментацыі неалітычнай керамікі. Бронзавы век на тэрыторыі Беларусі. Цесная сувязь мастацкай творчасці з усталяваўшайся міфалагічнай сістэмай. Жалезны век. Гарадзішчы. Вырабы з металу, шкла, керамікі. Мастацкая культура славянскіх племянных аб’яднанняў VII–X стст. Ювелірныя ўпрыгажэнні, як этнавызначальная прыкмета жыхароў на тэрыторыі Беларусі.

### 21. Архітэктурныя помнікі XI–XIII стст.

Сувязі з суседнімі дзяржавамі, Візантыяй і Заходняй Еўропай. Трансфармацыя візантыйскіх традыцый на тэрыторыі Беларусі. Асноўныя формастваральныя прынцыпы крыжова-купальнага храма. Месца Полацка ў асяроддзі іншых культурных цэнтраў. Асаблівасці будаўнічай тэхнікі полацкіх дойлідаў. Панямонская школа дойлідства. Аздабленне інтэр’ера культавых будынкаў. Манументальны жывапіс. Роспісы храмаў Полацка.

### 22. Іллюмінацыя, мініяцюрная пластыка і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў XI–XIII стст.

Афармленне рукапіснай кірылічнай кнігі. Мастацтва мініяцюры і шрыфту. Разьба па косці і камені. Ганчарныя вырабы. Функцыянальнасць і эстэтыка формаў посуду. Асноўныя тэхнікі мастацкай апрацоўкі дрэва. Цэнтры шкларобства. Асаблівасці мясцовай тэхналогіі вырабу шкла. Ювелірнае мастацтва. Віды металічных упрыгажэнняў. Касцюм жыхароў Беларусі ў XI–XIII стст.

### 23. Архітэктура і горадабудаўніцтва XIV–XVI стст.

Стылёвыя рысы раманскай архітэктуры. Тыпы гатычных канструкцый, кампазіцый і дэкору. Пранікненне рысаў рэнесанса ў беларускую архітэктуру. Мураванае абарончае дойлідства. Этапы развіцця замкавага

будаўніцтва. Галоўныя фактары горадабудаўніцтва XVI ст. Новая планіровачная структура гарадоў. Узоры культавай архітэктуры абарончага тыпу.

**24. Жывапіс, скульптура і графіка XIV–XVI стст.**

Манументальны жывапіс. Удзел беларускіх майстроў у роспісах храмаў і замкаў суседніх краін. Візантыйскія традыцыі ў іканапісе XV ст. Абразы XVI ст. Рысы заходнееўрапейскага жывапісу ў абразах. Абнаўленне тэматыкі, свабода жывапісных прыёмаў. Зараджэнне свецкага партрэта. Развіццё рукапіснай кнігі ў XIV–XVI стст. Скульптура XVI–XVII стст. Пластыка малых формаў: медальёны, каменныя абразкі. Драўляная пластыка. Майстра Ананій. Гатычныя рысы ў беларускай алтарнай скульптуры XVI-XVII стст. Рэнесансныя рысы ў мемарыяльнай скульптуры XVI–XVII стст. Графіка XVI ст. Узнікненне і развіццё беларускага кнігадрукавання. Дзейнасць Францішка Скарыны. Гравюры Заблудаўскай друкарні і друкарні Мамонічаў у Вільні. Дзейнасць П. Мсціслаўца.

**25. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XVI–XVII стст.**

Росквіт цэхавай рамесніцкай вытворчасці. Мастацкая апрацоўка металу. Ювелірнае мастацтва. Чаканныя і гравіраваныя вырабы (шаты, паціры, абклады кніг і інш.). Кавальскія вырабы ў беларускай архітэктуры (крыжы, акоўкі, алтарныя перагародкі, мэбля і інш.). Мастацкае ліццё. Кераміка. Цэнтры па вырабу архітэктурнай керамікі. Уплывы галандскіх і італьянскіх майстроў на выраб кафлі. Асартымент і мастацкія асаблівасці вырабаў са шкла. Ткацтва. Мастацкае афармленне культавых вырабаў.

**26. Архітэктура XVII–XVIII стст.**

Грамадска-палітычныя перадумовы распаўсюджання барока на Беларусі. Першыя пабудовы з рысамі барока на Беларусі. Выяўленчыя сродкі архітэктуры барока. Перыядызацыя архітэктуры барока на Беларусі. Горадабудаўнічыя ансамблі вялікіх і малых гарадоў. Трансфармацыя замкавага будаўніцтва ў палацава-замкавае, а пасля ў палацавую архітэктуру. “Віленскае барока”. Культавае драўлянае дойлідства XVII–XVIII стст.

**27. Жывапіс, графіка, скульптура XVI–XVIII стст.**

Іканапіс XVII–XVIII стст. Змястоўнасць вобразаў, насычанасць этнаграфічнымі элементамі, блізкасць да народнага светаўспрымання. Фарміраванне Палескай, Магілёўскай, Віцебскай іканапісных школ. Свецкі жывапіс. “Сармацкі партрэт”. Творы Б. Стробеля, І. Шрэтэра. Барочны манументальны жывапіс XVII–XVIII стст. у храмах Гродна, Нясвіжа, Магілёва, Мсціслава. Творы Ф. К. Д. Гескага. Беларускае кнігадрукаванне, кніжная гравюра XVII–XVIII стст. Друкарні ў Магілёве, Брэсце, Еўі і інш. Магілёўская і Віленская гравёрныя школы. Творчасць М. Вашчанкі, В. Вашчанкі, Т. Макоўскага, А. Тарасевіча, Л. Тарасевіча, Ф. Ангілейкі, П. Афанасія, Г. Лейбовіча. Скульптура XVII–XVIII стст. Барочныя алтарныя

комплексы. Манументальна-дэкаратыўная стукавая пластыка. “Нізавое” барока.

**28. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XVII–XVIII стст.**

Разьба па дрэве ў інтэр’еры культавых пабудоў. “Беларуская рэзь”. Мастацтва архітэктурнай керамікі XVII ст. Творчасць беларускіх майстроў, якія былі пераселены за межы Беларусі. К. Міхайлаў, Палубес (С. Іванаў), І. Паўлаў, “старац” Арсен і інш. Мастацкае ткацтва ў каралеўскай мануфактуры і мануфактурах Радзівілаў і Агінскіх. Мастацкае шкло. Мануфактуры шкла ў Налібоках, Урэччы, Гродна і інш.

**29. Мастацтва I паловы XIX ст.**

Горадабудаўнічая рэформа. Архітэктура палацавых ансамбляў XIX ст. Садова-паркавае мастацтва. Віленская школа (Віленскі ўніверсітэт) у развіцці беларускага мастацтва. Выхадцы з Беларусі – вучні пецярбургскай Імператарскай Акадэміі мастацтваў. Традыцыі класіцызму ў творчасці беларускіх мастакоў. Творчасць Ф. Смуглевіча, Ю. Аляшкевіча. Рамантызм. Гістарычны жывапіс. В. Ваньковіч. В. Дмахоўскі. Я. Дамель. Творчасць І. Хруцкага. Графіка. Гістарычныя і бытавыя замалёўкі Я. Дамеля, К. Бахматовіча. Архітэктурны краявід Н. Орды. Скульптура. К. Ельскі.

**30. Мастацтва II паловы XIX ст.**

Заснаванне Віленскага музея старажытнасцей. Вучоба выхадцаў з Беларусі ў навучальных установах Масквы і Пецярбурга. Віленская рысавальная школа І. Трутнёва. Уздым мастацкага жыцця ў канцы XIX ст. Архітэктура. Рост гарадоў, новыя тэхналогіі. Гарадскія асабнякі. Прамысловыя пабудовы. Эклектыка. Жывапіс: гістарычны жанр, бытавы жывапіс, краявід. К. Альхімовіч. А. Гараўскі. М. Сілівановіч. Графіка. Сацыяльная вастрыня і актуальна-грамадскі змест твораў. Творчасць М. Э. Андрыёлі. С. Богуш-Сестранцэвіча. А. Каменскага.

**31. Мастацкая культура мяжы XIX–XX стст.**

Творчасць і педагагічная дзейнасць Ф. Рушчыца. Мадэрн (сецэсія) у беларускім выяўленчым мастацтве і архітэктуры, дэкаратыўна-прыкладным мастацтве. Пераадоленне супярэчнасці паміж утылітарным і мастацкім аспектамі, сімвалічная трактоўка дэкору. Творчасць Т. Пайздэрскага, С. Шабунеўскага, Ф. Бруздовіча, В. Бубноўскага, К. Кастравіцкага, Г. Вейсенгофа, М. Міхалапа і інш. Мастацкае шкло. Вырабы Старэўскага, Барысаўскага шклозаводаў.

**32. Мастацкая культура 1918–1920-х гадоў на Беларусі.**

Авангардныя напрамкі ў беларускім мастацтве пач. XX ст. Мастацкае жыццё Віцебска 1918–1923 гг. Віцебская мастацкая школа. К. Малевіч – заснавальнік і кіраўнік УНОВИС (1920–1922). Асноўныя праграмныя палажэнні дзейнасці мастацкага аб’яднання. У. Стрэмінскі, яго тэорыя

“Унізм”. І-ІІІ Усебеларускія мастацкія выстаўкі. Мастацкія аб’яднанні “Прамень”, РАМБ і інш. Жывапіс. М. Станюта, У. Кудрэвіч. Станковая графіка. Кніжная графіка. Разнастайныя падыходы ў стварэнні мастацкай структуры кнігі. Часопісна-газетная графіка. Афармленне часопісаў “Маланка”, “Маладняк”. А. Астаповіч. С. Юдовін. А. Тычына. М. Філіповіч. Я. Мінін. А. Ахола-Вало. В. Дваракоўскі. Г. Змудзінскі. Плакат 1920-х. Л. Лісіцкі, П. Гуткоўскі. Скульптура 1920-х гадоў на Беларусі. Творчасць А. Бразера, А. Грубэ.

**33. Выяўленчае мастацтва канца 1920—1930-х гг.**

Архітэктура Беларусі 1920–1930-х гг. Элементы канструктывізму ў архітэктуры Беларусі. Перавага логікі і тэхнічнай дасканаласці над іншымі сродкамі стварэння архітэктурнага вобраза. Архітэктары Г. Лаўроў, І. Лангбард. Манументальнае мастацтва 1930-х гг. А. Бембель. Скульптура А. Глебава, З. Азгура, А. Бразера. Рэгламентаванасць мастацкага жыцця Савецкай Беларусі. Мастацкая культура Заходняй Беларусі. М. Сеўрук. П. Сергіевіч. Творчасць Я. Драздовіча.

**34. Беларускае мастацтва 1941–45-х гг.**

Выяўленчае мастацтва перыяду ВАВ. Жывапіс, графіка, скульптура. Агітацыйная графіка. Удзел беларускіх мастакоў у афармленні плакатаў-газет “Партызанская дубінка”, “Раздавім фашысцкую гадзіну”. Мастацкая і гістарычна-дакументальная каштоўнасць франтавых і партызанскіх замалёвак.

**35. Мастацкая культура Беларусі пасляваеннага дзесяцігоддзя.**

“Гераічны рэалізм” у творчасці беларускіх мастакоў. Жывапіс, станковая графіка (1945–1955). І. Ахрэмчык. В. Волкаў. У. Сухаверхаў. В. Бялыніцкі-Біруля. Скульптура БССР 1950-х гадоў. З. Азгур, Я. Глебаў, С. Селіханаў, А. Бембель. Архітэктура пасляваеннага дзесяцігоддзя. Асноўныя эстэтычныя задачы ў вырашэнні архітэктурнага асяроддзя. Стварэнне цэласнага горадабудаўнічага ансамбля цэнтра сталіцы Беларусі. Творчасць архітэктараў М. Паруснікава, М. Баршча, Г. Заборскага, А. Воінава і інш.

**36. Мастацкая культура другой паловы 1950-х–1960-х гг.**

Роля “хрушчоўскай адлігі” у развіцці мастацтва. Першы выпуск мастацкага факультэта БДТМІ (1959). “Суровы стыль” у беларускім жывапісе 1960-х. Г. Вашчанка, У. Стэльмашонак, В. Грамыка, М. Савіцкі, М. Данцыг, Л. Шчамялёў і інш. Праблема ансамбля і сінтэзу мастацтваў у манументальным мастацтве. Станковая графіка 1960-х. Прагрэсіўная роля кніжнай графікі 1960-х гг. А. Кашкурэвіч, А. Паслядовіч, А. Лось, В. Шаранговіч, Г. Паплаўскі і інш. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Мастацкае шкло (канец 1960-х). Шклозавод “Нёман”. Творчасць мастакоў У. Мурахвера, Л. Мягковай, У. Жохава і інш.

**37. Беларускае выяўленчае мастацтва 1970 – пачатку 1990-х гг.**

Жывапіс 1970-х гадоў. Пошук сапраўднай гістарычнай асновы. Манументальнае мастацтва 1970-х. Удзел беларускіх мастакоў і архітэктараў у стварэнні манументальных комплексаў. Пераемнасць традыцый і наватарства ў тэатральна-дэкарацыйным жывапісе 1980-х. Станковая і кніжная графіка 1980-х гг. Пошук новых форм у стварэнні мастацкай структуры кнігі. Творчасць М. Селяшчука, У. Савіча, В. Славука, У. Вішнеўскага і інш. Тэма нацыянальнага адраджэння ў беларускім жывапісе, скульптуры, графіцы 1980–1990-х гг. Архітэктурная кераміка у ансамблі грамадскага інтэр'еру. Творы Н. Байрачнага, А. Дзятлавай. Манументальная скульптура 1980–1990-х гг. Творчасць С. Гарбуновай, В. Янушкевіча, А. Дранца, А. Шатерніка, А. Фінскага і інш. Праца беларускіх скульптараў у сакральнай пластыцы. Асэнсаванне чарнобыльскай катастрофы ў беларускім жывапісе, графіцы, мастацкай фатаграфіі. Творчасць У. Кожуха, В. Шматава, Г. Вашчанкі, У. Тоўсціка, В. Альшэўскага, У. Шкарубы і інш. Беларускі плакат 1980–1990-х гг. Работы У. Цэслера і С. Войчанкі, А. Шэлюты, А. Кітаевай і інш. Беларуская мастацкая фатаграфія 1980–1990-х гг. Творчасць У. Шахлевіча, У. Парфянка, Г. Маскалёвай, І. Саўчанкі, А. Адамчык і інш. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва 1980–1990-х гг.: мастацкае шкло, кераміка, тэкстыль, саломапляценне. Творчасць Л. Лось, Т. Васюк, В. Бартлавай і інш.

**38. Выяўленчае мастацтва Беларусі ў канцы XX – пачатку XXI стагоддзя.**

Месца выяўленчага мастацтва ў беларускай культуры другой паловы 1990-х – пачатку 2000 гадоў. Новыя тэндэнцыі ў беларускім жывапісе, графіцы, скульптуры. Мастацкія праекты. Станковая і кніжная графіка пачатку 2000-х гадоў. Манументальнае мастацтва пачатку 2000 гадоў. Скульптура ў сучаснай гарадской прасторы. Удзел беларускіх мастакоў у міжнародных мастацкіх выстаўках, праектах.

## ЛІТАРАТУРА

*Асноўная літаратура:*

1. Баразна, М. Р. Гісторыя выяўленчага мастацтва Беларусі XX стагоддзя : вучэб. дапаможнік / М. Р. Баразна. – 2-е выд. – Мінск : Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў, 2017. – 320 с.
2. Гомбрих, Э. История искусства : пер. с англ. / Э. Гомбрих. – М. : АСТ, 1998. – 688 с.
3. Ильина, Т. В. История искусства. Западноевропейское искусство : учебник для вузов / Т. В. Ильина. – М. : Высш. школа, 2000. – 368 с.
4. Ильина, Т. В. Отечественное искусство : учебник для вузов / Т. В. Ильина. – М. : Высш. школа, 2000. – 407 с.
5. История искусства : в 2 т. / Российская академия художеств : ред. Е. Д. Федотова ; М. А. Бусев ; В. В. Ванслов [и др.]. – М. : Белый город, 2011-2013. – 2 т.
6. Лазука, Б. А. Гісторыя беларускага мастацтва : у 2 т. / Б. А. Лазука, рэд. Ю. А. Аверчанка. – Мінск : Беларусь, 2007. – 2 т.

*Дадатковая літаратура:*

**<u>Гісторыя замежнага выяўленчага мастацтва</u>**

1. Андреева, Е. Ю. Постмодернизм : искусство 2-й половины XX в. / Е. Ю. Андреева. – СПб. : Азбука-классика, 2007. – 367 с.
2. Арган, Дж. К. История итальянского искусства : в 2 т. / Дж. К. Арган. – М. : Радуга, 1990. – 2 т.
3. Базен, Ж. Барокко и рококо / Ж. Базен. – М. : Слово / Slovo, 2001. – 288 с.
4. Бенуа, А. Н. Русское искусство XVIII–XX вв. / А. Н. Бенуа. – М. : Яуза, Эксмо, 2004. – 618 с.
5. Боннар, А. Греческая цивилизация / А. Боннар. – Ростов-на-Дону : Феникс, 1994. – Т. 1. – 448 с.
6. Борисова, Е. А. Русский модерн / Е. А. Борисова, Г. Ю. Стернин. – М. : Советский художник, 1990. – 360 с.
7. Бьювэл, Р. Секреты пирамид. Созвездие Ориона и фараоны Египта / Р. Бьювел, Э. Джилберт. – М. : Вече, 1996. – 156 с.
8. Гайдамак, А. Русский ампир / А. Гайдамак. – М. : Трилистник, 2006. – 168 с.
9. Герман, М. Ю. Модернизм : Искусство первой пол. XX в. / М. Ю. Герман. – СПб. : Азбука-классика, 2005. – 473 с.
10. Грант, М. Цивилизация Древнего Рима / М. Грант. – М. : Центрполиграф, 2003. – 400 с.
11. Даниэль, С. М. Европейский классицизм / С. М. Даниэль. – СПб. : Азбука-классика, 2003. – 300 с.

12. Ильина, Т. В. Русский XVIII век. Изобразительное искусство. Музыка учеб. пособие для вузов / Т. В. Ильина, М. Н. Щербакова. – М. : Дрофа, 2004. – 512 с.

13. Каплан, М. Золото Византии / М. Каплан. – М. : Астрель, 2002. – 176 с.

14. Кастриа Маркетти, Ф. Живопись Ренессанса : открытие мира и человека / Ф. Кастриа Маркетти. – М. : Астрель, 2002. – 400 с.

15. Кенигсбергер, Г. Средневековая Европа, 400–1500 гг. / Г. Кенигсбергер – М. : Весь Мир, 2001. – 372 с.

16. Ле Гофф, Ж. Цивилизация Средневекового Запада / Ж. Ле Гофф. –Екатеринбург : Прогресс-Академия, 1992. – 376 с.

17. Любимов, Л. Д. Искусство Древнего мира / Л. Д. Любимов. – М. : Просвещение, 1980 – 320 с.

18. Нессельштраус, Ц. Г. Искусство раннего Средневековья / Ц. Г. Нессельштраус. – СПб. : Азбука-классика, 2000. – 384 с.

19. Поспелов, Г. Г. Русское искусство начала XX в. : судьба и облик России / Г. Г. Поспелов. – М. : Наука, 1999. – 126 с.

20. Раздольская, В. И. Европейское искусство XIX в. / В. И. Раздольская. – СПб. : Азбука-классика, 2009. – 368 с.

21. Ревалд, Д. Постимпрессионизм : от Ван Гога до Гогена / Д. Ревалд. – М. : Республика, 1996. – 464 с.

22. Сарабьянов, Д. Стиль модерн. История, истоки, проблемы / Д. Сарабьянов. – М. : Искусство, 1989. – 294 с.

23. Краснова, О. Б. Энциклопедия искусства Древнего мира / О. Б. Краснова. – М. : ОЛМА Медиа Групп, 2002. – 351 с.

24. Фостер Х. Искусство с 1900 года : модернизм, антимодернизм, постмодернизм / Х. Фостер [и др.]. – М. : Ад Маргинем Пресс, 2015. – 816 с.

**<u>Гісторыя выяўленчага мастацтва Беларусі</u>**

1. Баженова, О. Д. Радзивилловский Несвиж : росписи костела Божьего Тела / О. Д. Баженова. – Минск : Харвест, 2007. – 414 с.

2. Баразна, М. Р. Беларуская кніжная графіка 1960–1990-х гадоў / М. Р. Баразна. – Мінск : БелЭн, 2001. – 207 с.

3. Борозна, М. Г. Белорусская живопись 1920–1970-х годов / М. Г. Борозна. – Минск : БГАИ, 2006. – 192 с.

4. Воинов, А. А. История архитектуры Белоруссии. Советский период : учеб. пособие для вузов / А. А. Воинов. – Минск : Вышэйшая школа, 1975. – 216 с.

5. Габрусь, Т. В. Мураваныя харалы: Сакральная архітэктура беларускага барока / Т. В. Габрусь. – Мінск : Ураджай, 2001. – 287 с.

6. Габрусь, Т. В. Саборы помняць усе : готыка і рэнесанс у сакральным дойлідстве Беларусі / Т. В. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2007. – 166 с.

7. Гісторыя беларускага мастацтва : у 6 т. / рэдкал. : С. В. Марцэлеў ;

гал. рэд. Л. М. Дробаў , Б. А. Лазука [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1987–1994.

8. Дробов, Л. Н. Живопись Советской Белоруссии (1917–1975 гг.) / Л. Н. Дробов. – Минск : Высш. школа, 1979. – 304 с.

9. Жук, В. И. Живопись Беларуси на рубеже веков : потери и обретения / В. И. Жук. – Минск : Беларус. Навука, 2013. – 159 с.

10. Іканапіс Заходняга Палесся XVI–XIX стст. / В. Ф. Шматаў [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 348 с.

11. Кулагин, А. Н. Архитектура дворцово-усадебных ансамблей Белоруссии : вторая половина XVIII – начало XIX в. – Минск : Наука и техника, 1981. – 134 с.

12. Кушнярэвіч, А. М. Культавае дойлідства Беларусі XII–XVI стст. : Гістарычнае і архітэктурна-археалагічнае даследаванне / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 150 с.

13. Кушнярэвіч, А. М. Мураваная дабастыённая фартыфікацыя Вялікага Княства Літоўскага / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск : Беларуская навука, 2014. – 240 с.

14. Кушнярэвіч, А. М. Тыпалогія гатычнага абарончага культавага дойлідства Вялікага княства Літоўскага / А. М. Кушнярэвіч. – Мінск : МДЛУ, 2007. – 142 с.

15. Лявонава, А. К. Старажытнабеларуская скульптура / А. К. Лявонава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 203 с.

16. Нікалаеў, М В Палата кнігапісная : Рукапісная кніга на Беларусі ў X– XVIII стагоддзях. – Мінск : Мастацк. літаратура, 1993. – 239 с.

17. Пікулік, А. М. Мастацтва магілёўскіх старадрукаў / А. М. Пікулік. – Мінск : Тэхнапрынт, 2002. – 199 с.

18. Сакральная живопись Беларуси XV–XVIII веков / Сакральны жывапіс Беларусі XV–XVIII стагоддзяў / The painting sacred of Belarus XV–XVIII centuries / [автор текста и составитель Н. Ф. Высоцкая]. – Минск : Беларусь, 2007. – 219 с.

19. Селицкий, А. А. Живопись Полоцкой земли XI–XII вв. / А. А. Селицкий. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 171 с.

20. Церашчатава, В. В. Старажытнабеларускі манументальны жывапіс XI–XVIII стст. / В. В. Церашчатава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 181 с.

21. Шматов, В. Ф. Искусство книги Франциска Скорины / В. Ф. Шматов. – М. : Книга, 1990. – 205 с.

22. Яніцкая, М. М. Беларускае мастацкае шкло (XVI–XVIII стст.) / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1977. – 87 с.

23. Яніцкая, М. М. Беларускае мастацкае шкло, XIX – пачатак XX ст. / М. М. Яніцкая. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 141 с.